# ЮНЫЯ ПАРЛАМЕНТАРЫІ З ЛЁЗНА

## Як у невялікім мястэчку моладзь дапамагае мясцовым уладам

**Сёння ў беларускай моладзі ёсць шмат магчымасцяў выказацца. Ёсць сацыяльныя сеткі, але віртуальныя звароты не даюць такога эфекту, як жывыя зносіны. Каля 10 гадоў у Беларусі існуе праект, які дазваляе таленавітым маладым беларусам не толькі гаварыць, але і рэалізоўваць сябе ў грамадскай дзейнасці, — Маладзёжная палата. Як яна функцыянуе і якую рэальную сілу мае такое аб'яднанне — наш карэспандэнт высветліў на прыкладзе Маладзёжнай палаты пры Лёзненскім раённым Савеце дэпутатаў.**



Члены Маладзёжнай палаты 3-га склікання.

### Што? Дзе? Навошта?

Маладзёжная палата ў Лёзне пачала дзейнічаць у снежні 2010 года і стала пілотным праектам на Віцебшчыне. «Гэта 27 прадстаўнікоў школ Лёзненскага раёна, якія ўдзельнічаюць у сесіях, прадстаўляюць інтарэсы моладзі, уносяць прапановы ў органы мясцовага самакіравання Лёзненскага раёна па пытаннях маладзёжнай палітыкі, праводзяць тлумачальную работу сярод моладзі. Палата створана для папулярызацыі мясцовага самакіравання, — адзначыла **галоўны спецыяліст аддзела па ідэалагічнай рабоце, культуры і справах моладзі Лёзненскага райвыканкама Ірына КУДРАЎЦАВА**. — Школьнікі знутры бачаць сістэму кіравання, удзельнічаюць у пасяджэннях раённага Савета дэпутатаў, маюць магчымасць прапанаваць уласнае рашэнне праблемных пытанняў. Я ўпэўнена, такое аб'яднанне — добрая школа для падрыхтоўкі будучых кадраў, у тым ліку кіруючых».

Выбары ў Маладзёжную палату праводзяцца па аналогіі з выбарамі ў органы мясцовага кіравання і самакіравання. У кожнай школе ініцыятыўныя хлопчыкі і дзяўчаткі, якія валодаюць арганізатарскімі здольнасцямі і жадаюць паспрабаваць свае сілы ў падобным аб'яднанні, прадстаўляюць свае праграмы. На агульным сходзе школы вучні галасуюць за найбольш цікавую, а аўтар, які набірае найбольшую колькасць галасоў, становіцца членам палаты. Кіруе Маладзёжнай палатай старшыня, які абіраецца шляхам адкрытага галасавання з ліку абраных членаў.

Асноўныя формы дзейнасці Маладзёжнай палаты — гэта работа ў пяці пастаянных камісіях: па грамадзянска-патрыятычным выхаванні моладзі і прафілактыцы правапарушэнняў, па папулярызацыі фізічнай культуры і спорту, прапагандзе здаровага ладу жыцця. Яшчэ ёсць камісіі па пытаннях экалогіі, развіцці валанцёрскага руху і сувязях з грамадскімі арганізацыямі, па арганізацыі вольнага часу і правядзенні культурна-масавых мерапрыемстваў для моладзі і па пытаннях агульнай сярэдняй адукацыі і прафарыентацыі школьнікаў.

Яны таксама ўдзельнічаюць у пасяджэннях, якія праходзяць раз на квартал, і ў сесіях — раз на паўгоддзе. На сесіях падводзяцца вынікі работы, разглядаюцца і абмяркоўваюцца праекты рашэнняў.

### Маладыя — раяць, улада — падтрымлівае

Трэба адзначыць: рашэнні, што прымаюцца на сесіях, носяць рэкамендацыйны характар, аднак яны заўсёды бяруцца ўладай пад увагу. Па словах **першага сакратара Лёзненскай раённай арганізацыі БРСМ Наталлі БІЗУНКОВАЙ**, палатай уносяцца і рэалізуюцца шматлікія прапановы. Вялікая ўвага ўдзяляецца добраўпарадкаванню і навядзенню парадку на зямлі. Напрыклад, па ініцыятыве ўдзельнікаў палаты ў рамках праекта «Двары для дзетвары» на тэрыторыі раёна былі арганізаваны 4 дзіцячыя пляцоўкі, якія абсталёўваліся разам з камунальнікамі, работнікамі лясгаса, жыхарамі дамоў. Прычым іх не проста зрабілі і забылі: яны і цяпер падтрымліваюцца ў належным стане.

— На высокім узроўні працуюць і валанцёрскія атрады, — адзначыла Наталля Бізункова. —

> У кожнай школе ініцыятыўныя хлопчыкі і дзяўчаткі, якія валодаюць арганізатарскімі здольнасцямі і жадаюць паспрабаваць свае сілы ў падобным аб'яднанні, прадстаўляюць свае праграмы.

Члены Маладзёжнай палаты з дапамогай органаў мясцовай улады і кіраўнікоў арганізацый раёна ў снежні 2016 года арганізавалі дабрачынны марафон, падчас якога быў наладжаны канцэрт і аказана дапамога грашамі і падарункамі сарака хлопчыкам і дзяўчаткам з абмежаванымі магчымасцямі.

— Адным са знакавых праектаў стаў «Мост шлюбаў» у Лёзне, дзе маладыя могуць зладзіць фотасесію, — кажа Ірына Кудраўцава. — Дзякуючы ідэі Маладзёжнай палаты пры падтрымцы старшыні Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі па рэгіянальнай палітыцы і мясцовым самакіраванні Аляксандра Папкова на тэрыторыі сярэдняй школы №1 з'явіўся пладовы сад, ім заняты цэлы гектар прышкольнага ўчастка. Высаджана «Алея выпускнікоў», на якой амаль сотня кустоў бэзу. Тут можна не толькі прайсціся, але і пасядзець на прыгожых лаўках. Па словах Ірыны, традыцыйным стаў удзел моладзі і ў рэспубліканскіх экалагічных акцыях.

«У нас ёсць ініцыятывы, якія выходзяць за межы Беларусі, — дадала Наталля Бізункова. — Разам з моладдзю Рудняньскага, Ельніцкага, Веліжскага і Дзямідаўскага раёнаў Расійскай Федэрацыі мы рэалізуем патрыятычныя праекты, праводзім сумесныя семінары, культурныя і спартыўныя мерапрыемствы».

### Стартавая пляцоўка

Нягледзячы на тое, што ўдзельнікамі палаты з'яўляюцца маладыя людзі, яны вельмі адказна падыходзяць да сваіх прапаноў і рэалізацыі ўласных ідэй.

— Працаваць з Маладзёжнай палатай вельмі цікава, — згаджаецца Ірына Кудраўцава. — Мы назіраем, як у маладых складваецца комплекснае паняцце аб дзяржаўным кіраванні на рэгіянальным узроўні. Гэтаму паспрыялі і сустрэчы членаў Маладзёжнай палаты з дэпутатамі Палаты прадстаўнікоў і членамі Савета Рэспублікі, якія арганізоўваліся пры падтрымцы Лёзненскага раённага Савета дэпутатаў.

З 46 членаў Маладзёжнай палаты папярэдніх скліканняў у вышэйшыя навучальныя ўстановы паступілі 44, у сярэдніх спецыяльныя — 2. Хто ведае, магчыма, некалі ў Палаце прадстаўнікоў з'явяцца дэпутаты, якія пачыналі з Маладзёжнай палаты. Прынамсі, стартавая пляцоўка ў іх вельмі грунтоўная.

**Уладзіслаў ЛУКАШЭВІЧ.**
*lukashevich@zviazda.by*


## Извещение о повторном аукционе 28 апреля 2017 г. по продаже объектов недвижимости в г. Пинске

| Наименование объекта | Изолированное помещение с инвентарным №130/D-54077 «Цех строительных металлоконструкций» | Изолированное помещение с инвентарным №130/D-54078 «Цех изготовления металлоконструкций» | Изолированное помещение с инвентарным №130/D-54080 «Заготовительный цех» | Капитальное строение с инвентарным №130/С-46621 «Здание проходной с навесом и покрытием» | Изолированное помещение с инвентарным №130/D-50656 «Административное помещение с коммуникациями» | Капитальное строение с инвентарным номером 130/С-44659 (здание компрессорной с прилегающими сооружениями и инженерными сетями) |
|---|---|---|---|---|---|---|
| Номер лота | 1 | 2 | 3 | 4 | 5 | 6 |
| Местонахождение объекта | г. Пинск, ул. Калиновского, 11И-1 | г. Пинск, ул. Калиновского, 11И-2 | г. Пинск, ул. Калиновского, 11Г-2 | г. Пинск, ул. Калиновского, 11А | г. Пинск, ул. Калиновского, 11-1 | г. Пинск, ул. Калиновского, 11П |
| Тип помещения | Совмещенное с другим изолированным помещением | Совмещенное с другим изолированным помещением | Совмещенное с другим изолированным помещением | Отдельно стоящее | Совмещенное с другим изолированным помещением | Отдельно стоящее |
| Общая площадь (кв. м) | 3982,2 | 4516,7 | 3351,5 | 81,0 | 3482,1 | 539,0 |
| Площадь земельного участка для обслуживания строения (га) | 1,444 | | | 0,0527 | | 0,1827 |
| Начальная цена продажи | 206 828,90 | 234 471,39 | 230 554,37 | 29 950,20 | 199 639,37 | 89 891,85 |
| Сумма задатка | 20 682,90 | 23 447,15 | 23 055,45 | 2 995,02 | 19 963,95 | 8989,20 |
| Затраты на оценку, организацию и проведение аукциона, рублей | | | | 1585,04 | | |
| Условия продажи | Возможна рассрочка в соответствии с действующим законодательством | Возможна рассрочка в соответствии с действующим законодательством | Возможна рассрочка в соответствии с действующим законодательством | Возможна рассрочка в соответствии с действующим законодательством | Возможна рассрочка в соответствии с действующим законодательством | Возможна рассрочка в соответствии с действующим законодательством |
| Характеристика объекта, площадь земельного участка (кв. м), решение об отводе земельного участка | Одноэтажное, состоит из 3 пролетов по 2160 м² каждый. В состав входит: покрасочное отделение с локальными очистными сооружениями, водопроводная сеть – 127,4 м, канализация фекальная – 91,5 м, ливневая канализация – 143,4 м, линия электропередачи – 593 м, беседка, бетонное покрытие – 2290,2 м². Ввод в эксплуатацию – 1973 г. | Одноэтажное, состоит из 3 пролетов по 2160 м² каждый. В состав входит: водопроводная сеть – 157,2 м, канализационная сеть – 163,3 м, линия электропередачи – 593 м, беседка, бетонное покрытие – 1922,8 м². Ввод в эксплуатацию – 1973 г. | Одноэтажное, в состав входит: склад пиломатериалов – 1389 м², навес – 284 м², водопроводная сеть протяженностью 248,9 м, асфальто-бетонное покрытие – 1876 м², бетонное покрытие – 2751 м², линия электропередачи (ААБЛ-10 3*95) – 200 м, ливневая канализация – 30,8 м, ремонтная мастерская, административные и санитарные помещения. Ввод в эксплуатацию – 1972 г. | Одноэтажное. Состоит: здание проходной – 81 м², навес – 35 м². Покрытие асфальтобетонное – 234 м². Отопление: печь, котел на твердом топливе. Ввод в эксплуатацию – 1979 г. | Здание трехэтажное с внутренними собственными коммуникациями (водопроводная, канализационная сеть, линия электропередачи). Имеется отопление (собственная котельная). Ввод в эксплуатацию – 1971 г. | Одноэтажное здание. Канализационная сеть – 73 м, водопроводная сеть – 20,4 м, бетонное покрытие – 701м². Ввод в эксплуатацию – 1992 г. |
| Организатор аукциона | Ликвидационная комиссия ОАО «Пинский КСИ», ТУП «ПриБут» | | | | | |
| Продавец аукциона | Ликвидационная комиссия ОАО «Пинский КСИ», ТУП «ПриБут» | | | | | |

Аукцион состоится **28 апреля 2017 года в 11.00** по адресу: г. Пинск, ул. Калиновского, 11, в актовом зале.

**Перечень необходимых документов:**

1. Заявление на участие в аукционе по установленной форме и подписанное соглашение с ОАО «Пинский комбинат строительной индустрии».

**2. Заверенная банком копия платежного поручения о внесении суммы задатка: на расчетный счет ОАО «Пинский комбинат строительной индустрии», р/с 3012470120029 в РКЦ №37 в г. Пинске филиала ОАО «Белагропромбанк» – Брестское областное управление код 401, УНП 200305504 , срок внесения суммы задатка – по 27 апреля 2017 г. включительно.**

3. Индивидуальным предпринимателем – копия свидетельства о государственной регистрации и его подлинник для заверения его копии организатором торгов.

4. Юридическим лицом – доверенность, выданная представителю юридического лица (кроме случаев, когда юридическое лицо представляет его руководитель), а также копии учредительных документов и свидетельства о государственной регистрации юридического лица, и их подлинники, для заверения их копий организатором торгов.

5. Представителем гражданина Республики Беларусь или индивидуального предпринимателя – доверенность.

При подаче документов на участие в торгах граждане Республики Беларусь, иностранные граждане, физические лица (граждане Республики Беларусь и лица без гражданства), постоянно проживающие за пределами Республики Беларусь, в том числе представители юридических лиц Республики Беларусь, представители иностранных инвесторов, предъявляют паспорт или иной документ, удостоверяющий личность, а руководитель юридического лица также документ, подтверждающий его полномочия.

Организатор торгов имеет право отказаться от проведения аукциона в любое время, но не позднее, чем за три дня до даты его проведения.

Победителем аукциона признается участник, предложивший наибольшую цену.

Победитель аукциона (претендент на покупку) обязан подписать протокол аукциона в день проведения аукциона; в течение 3 рабочих дней со дня проведения аукциона возместить затраты на оценку, организацию и проведение аукциона; подписать договор купли-продажи недвижимого имущества в течение 10 рабочих дней со дня проведения аукциона

Порядок проведения аукциона определен в соответствии с Положением о порядке организации и проведения аукционов.

**Заявления на участие в аукционе с прилагаемыми документами принимаются по адресу: г. Пинск, ул. Калиновского, 11, каб. 2, с 9.00 до 15.00 по рабочим дням по 27 апреля 2017 года включительно, тел. 80165-37-16-19, тел./факс (80165) 37-16-66. Контактный телефон +375-29-640-80-37**